# С А К А В І К

***Гуканне вясны (Гувясна, Вясна, Прошчаны дзень, Гавенны дзянёк), Масленыя (Масныя, Паставыя) загавіны (Мясное пушчанне, Сырапусная)** – апошні дзень (нядзеля) Масленага тыдня, дзень сустрэчы вясны. Вядомы і ў іншыя дні (гл.: 14, 25 сакавіка, 7 красавіка).Асабліва распаўсюджана і разнастайна традыцыя на Усходнім Палессі. На Петрыкаўшчыне гукалі вясну з караваем (аграрная магія, куль нівы), на Століншчыне – з "жаваронкамі" (культ жывёлы); на Тураўшчыне і Лельчыцкім раёне рабілі вянок з барвянка і з песнямі "Ой, венчэ-барвенчэ", "Вясна-красна" вешалі яго на бярозку (культ расліны), "чыркавалі" (веснавалі) – вадзілі карагоды, спявалі пра чырачку ("Ой, чырачка-пташачка, не залятай далечка"), насілі ёлку з вянком, спяваючы "Ой, вясна-вясняначка". У некаторых раёнах пыталіся: "Ці пазволіце, старыя людзі, нам вясну-красну выгукаці", у іншых прыказвалі: "Благаславі, Божа, зіму замыкаці... вясну загукаці". Вяснянкі спявалі на высокіх месцах ("красных горках", стагах, стрэхах і інш.). Песні чуліся з розных бакоў, адбывалася пераклічка гуртоў выканаўцаў. Характэрнай асаблівасцю вяснянак з'яўляецца выгукванне "Гу-у!". Па ўяўленні нашых продкаў, Вясна ехала "на сошаньцы, на баронцы", "на залатым кані". Тэматыка песень: пра вясну, птушак, кросны, каханне. Праяўляюцца міфалагічныя вобразы Вясноўкі, Ярылы – божышча веснавой урадлівасці і пладавітасці жанчыны.

Вобраз вадаплаўнай птушкі -- чырачкі, вутачкі, качара (селязня), гусачкі -- вядомы не толькі ў каляндарна-абрадавай паэзіі, але і ў іншых жанрах і відах фальклору, куды ён мог прыйсці з веснавых звычаяў. Праяўленне яго – сляды татэмістычных уяўленняў чалавека, што цягнуцца з неаліту (Лозка, 1996. С. 37).

Яшчэ рускі даследчык Я.Анічкаў (1903. С. 89) заўважаў, што "абрад гукання захаваўся ў Беларусі і некаторых месцах Вялікаросіі", прыводзіў паралелі з абрадам "на раніла" у сербаў, з вітаннем сонца ў палякаў і чэхаў, адзначаў, што "у Стакгольме на пачатку Вялікага посту адбывалася нешта вельмі блізкае да нашага "гукання" (с. 102).

П.Шэйн лічыў, што абрадавы характар сустрэчы вясны больш захаваўся ў Беларусі і "толькі ў беларусаў існуе правільнае размеркаванне беларускіх песень" (Шэйн, 1877. С.474).Грунтоўны аналіз звычаяў сустрэчы вясны ў народаў Еўропы зрабіла Г.Барташэвіч, з высновамі якой неабходна пагадзіцца: "для беларусаў і ўкраінацў ядро абраду складае фальклор, які ў рускіх адыходзіць на другі план... У беларусаў пры большай захаванасці і разнастайнасці абрадавых дзеянняў і фальклор вылучаецца кансервацыяй старадаўніх магічных песенных жанраў – веснавых заклікanняў, у той час як у ўкраінцаў на першы план выступалі "звычаёва–абрадавыя песні і гульні" (1985. С.17). У народаў Еўропы даследчыца вылучае веснавое паленне кастроў, у Балгарыі яшчэ звычаі "зора" (зара), або "гора" (лес), калі моладзь

спявала любоўныя песні, павярнуўшыся на ўсход, абрадавае печыва “маладзенцы” з зааморфнымі фігуркамі на Саракі; у народаў Албаніі звычай хаджэння моладзі па дварах з песнямі, пажаданнямі, аналагічныя нашым велікодным абыходам (с. 25-26).

***Паласказуб (Пласказуб, Панядзелак Пласказуб, Папалакіны, Паслязапусак), Шыльны (Шылаваты) панядзелак --** першы дзень Вялікага посту (7 тыдняў). На Віцебшчыне раней у гэты дзень гулялі ў карчме, што называлася "кавяць шыла"(Шэйн, 1902). Другая крыніца так тлумачыць выраз “куваці шыла”: “г. зн. піццё гарэлкі”, “паласкаць зубы, трэба, каб яны хутчэй “давыкалі да посніцы...” (Нікіфароўскі, 1897). Найменне звязана з піццём гарэлкі (апошні дзень перад постам, калі яшчэ можна было хоць "папаласкаць зубы". Увесь пост царква не дазваляла есці мяса, піць малако, спяваць песні, танцаваць. Існаваў звычай, калі хлопцы насілі ступу і складалі туды розныя рэчы дзяўчат, якія не паспелі выйсці замуж. Дзяўчаты адкупліваліся, і ўсе разам гулялі. У розных раёнах Беларусі вешалі калодкі хлопцам, якія не ажаніліся. У ваколіцах Тыкоціна і Бельска, на памежжы з Польшчай, мужчыны і жанчыны ў карчме скакалі цераз калоду, "каб лён быў высокі" і таўклі ў ступе ваду (Глогер, 1868). На Свіслаччыне гэты дзень называўся Паслязапусак. Прызнавалася добрай прыметай, калі першым у хату з раніцы заходзіў мужчына, а калі жанчына – лічылася, што будуць развальвацца сыры.

У некаторых раёнах Палесся называўся першы дзень Посту – Дужыкі. Пяклі столькі “каржы”-дужыкі з белай мукі на кожную “душу” у хаце (Талстая, 1986).

Пост нарадзіўся ў Хрыстову пару, калі Выратавальнік знаходзіўся без ежы з малітвамі ў іудзейскай пустыні. Цяпер ён разумееца хрысціянамі не толькі як адмова ад скаромнай (жывёльнай) ежы, але як і духоўнае ўстрыманне ад дрэнных прывычак. Ён рыхтуе чалавека да Светлага Хрыстова Уваскрашэння. Гэтаму садзейнічае і народная традыцыя.

**2/17. Дзень Фёдара Цірана.** Хрысціянскі вялікапакутнік Фёдар Ціран, воін з г.Амасіі, быў замучаны (спалены) Максіміянам каля 306 года за тое, што не адмовіўся ад Хрыста. Магчыма, зладзейства супраць чалавека аказала вялікае ўздзеянне на народ, што ў некаторых месцах Фёдара сталі лічыць заступнікам ад зладзейства (Раманаў, 1912).

У румынаў san–Toder з'яўляецца “рухомым” святам, якое адзначаецца ў першую суботу Вялікага посту. Пра міфалагічную істоту Тодара, які выратаваў сонца для людзей, існуе нямала легендаў (КЗ, 1977. С. 299).

***Уступная серада –** серада першага тыдня Вялікага посту. Каб урадзіў добры лён, у гэты дзень мылі верацёны ці калаўроты (прылады, што служылі для прадзення), а таксама балявалі ў карчме і пераскаквалі цераз пень, што ставілі пасярод хаты (Глогер, 1876).

**4/19.** ***Казімір (Казімер).*** У некаторых валачобных песнях, з'арыентаваных на каталіцкі каляндар, упамінаецца як “першае святца”, г.зн. першы дзень земляробчага года (Новы год):

Святы Казімір
Дровы сякець
І ў клад кладзець.

У заходніх раёнах Беларусі вядома прымаўка: "На Казімера зіма памірае"(Паўлюкоўскі, 1934). У Свіслацкім раёне кажуць: "Казімера -- зіма ўмера" (зафіксавана яшчэ і Федароўскім у мінулым стагоддзі – гл. Т. IV. С. 143)."Казімера дзень і ноч умера". Відаць, не толькі памірае, а і "ў меру", калі маецца на ўвазе, што 20 ці 21 сакавіка бывае дзень вясенняга раўнадзенства.

**9/24. Янка (Абертас, Паўраценне).** “Усе з галавою, а Янка дык не. Янкавай галавы баіцца зіма” (Паўлюкоўскі, 1934). Гэты дзень яшчэ называецца Абертас (Паўраценне). Птушкі пачынаюць вяртацца з выраю. У царкоўным календары – свята знаходжання (“обретения”) галавы Іаана Хрысціцеля. Свяшчэннік І.Берман у Ашмянскім павеце заўважаў: пчаляры ўжо глядзелі вуллі, а калі пчолы “арэтаюць” – значыць дажылі, а гэта лічылася знакам, што яны выжывуць. Як зазначаў святар, тады ж і мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на бок. Вось чаму дзень мае найменне Паўраценне (Берман, 1869. С. 46).

**10/25.** ***Сорак мучанікаў (Прыска)*** – свята сустрэчы птушак. Прыска – адзін з сарака мучанікаў, якія пакутвалі ў Севасційскім возеры. На гэты конт існуе выслоўе: “На святога Прыску праб'е лёд і пліска” (Паўлюкоўскі, 1934).

**12/27.** ***Рыгор.*** Пра гэты веснавы прысвятак вядома прыказка: "На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора" (БСК, 1937).

У некаторых краінах Еўропы па старому царкоўнаму календару лічылася, што дзень святога Грагора прыпадаў на вясенняе раўнадзенства, таму ў шведаў, нарвежцаў, датчан існуе прымаўка, што “ў дзень Грагора ноч і дзень роўныя” і яны вераць, што павінна прыляцець варона, вястунка вясны (КЗ, 1977. С. 115); скандынавы і фінскія лапары ведаюць, што ў гэты дзень прылятае з пабярэжжа першая птушка (с. 135); чэхі гавораць: “На Грэгоржа дурны той селянін, які не арэ” (с. 222). Французы пачыналі стрыжку авечак у дзень Обена (1 сакавіка) ці Рыгора.

**13/28. Васіль Капальнік (Васіль і Марына, Валосся і Мура)**. У народнай традыцыі гэтыя хрысціянскія імёны асацыіруюцца з забаронай на прадзенне, таму што яно ў сваю чаргу звязана з вадкасцю -- неабходнасцю "слініць" пяньку. А каб не надышлі зноў маразы, нельга "адслініць замураваную зіму"(Нікіфароўскі, 1897). Васіля празвалі "капальнікам", таму што "На Васіля Капальніка са стрэх капае".

М. Нікіфароўскі зафіксаваў у 1897 годзе і згадку пра язычніцкага Вялеса і неразгаданага Мура (с. 238).

У царкоўным календары ў дадзены дзень акрамя прападобных Васіля і Марыны адзначаюць каля дзесятка іншых святых, але чамусьці ў народным календары погляд засяродзіўся іменна на гэтых.

*__Зборава субота__ -- субота першага тыдня Вялікага посту. На Усходнім Палессі ў гэты дзень праводзілі абрад "споведзі дзежкі". Яе мылі, накрывалі новым ручніком, падкурвалі воскам, кідалі туды вугельчык. Не заквашвалі ў гэты час ў ёй хлеб, бо лічылі, што цяжка будзеісці дзежцы на споведзь.

Для некаторых раёнаў Зборная субота лічылася памінальным днём продкаў (Талстая, 1986).

Сербы, чарнагорцы, македонцы суботу першага тыдня посту называлі Тодаравай, або Тэадоравай суботай (Тодарыца, Тудурыца, Конскі Вялігдан) і лічылі яе святам жывёлы, перш за ўсё коней (КЗ, 1977. С. 253).

*** Збор (Ізбор, Узбор, Зборніца) --** нядзеля першага тыдня **(Зборнага)** пасля Масленіцы, першае свята "Новага Лета", "Бажаства". Лічыўся пачаткам збору селяніна да выезду ў поле. Птушкі таксама збіраліся вяртацца на радзіму. У некаторых песнях Збор нагадвае канкрэтную святую асобу, культ, апекуна новага года, і па колькасці варыянтаў песень, прадстаўленых у томе "Валачобныя песні" (Мн., 1980) у адпаведным раздзеле, пераважае над іншымі святамі і прысвяткамі. Звычайна Збор ідзе наперадзе Аўдоцці, калі яна наогул упамінаецца.

... Сам Бог сядзіць, ксёнжку дзяржыць.
Каля яго пчолкі лятали,
Пчолкі лятали, мяды збіралі.
Тыя пчолкі, усе святачкі,
Перад Богам збіраліся,
Збіраліся, рахаваліся,
Катораму святу ўперад стаці.
А Збор мовіць гаспадару:
- Слаўны мужу над мужамі!
Тваё дзела -- на торг ехаць,
Зялеза купляць, нарогі каваць.
Аўдакею дровы сячэць...

*(Зап. у 1896 г. у Дзісенскім п.)*

У некаторых варыянтах песень на першым месцы ў годзе ставіцца Раство. Тэксты аб Новым годзе выглядаюць пазнейшымі дапаўненнямі да валачобных песень, якія прымаюць імправізацыі здольных выканаўцаў. У такой песні, зафіксаванай у 1976 годзё ў в.Крыўцы Лепельскага раёна (гл.

"Валачобныя песні", № 77), Збор ужо заменены Аўдакеяй і названы першым вясеннім святам ("Аўдакея -- Первы празнік// Да й вясненскі").

Вось як характарызуецца язычніцкі Збор у народных песнях: "Святы Збор ляды разбіваець" (№ 68); "А потым таго святы й Ізбор, // Святы й Ізбор -- пагнала снег з гор, // Снягі зганяець, воды пускаець" (№ 69); "Святы Ізбор// Упярод ступіць, // Зімку зрадзіць, // Сошку ладзіць" (№ 73); "А йшоў напярод да й святы Ізбор, // А святы Ізбор -- да бяжыць вада з гор, // Бяжыць вада з гор, а рыбінка з нор. // А святы Ізбор да й лемяшы купіў" (№ 75); "Первы Празнік // Святы Ізбор // Пусціць ваду з гор, // Рыбку са ставу" (№ 90).

Таксама ў народзе ведалі, што "ў Зборніцу ўсе залётныя птушкі збіраюцца за морам і адлятаюць бліжэй да нас – на столькі міляў, колькі дзён прайшло ад Грамніц да Зборніцы" (Нікіфароўскі, 1897). На Ўкраіне, як і ў нас, гаварылі: "Неділя Збир -- тече вода з гір" (Ярмолаў, 1901. С. 105).

Свята і зараз вядома асабліва на Віцебшчыне.

**14/29. Касьян.** Згодна народнаму павер'ю (гл таксама 29 лютага), за тое, што Касьян падпаліў Іаану Хрысціцелю вусы, Бог пакараў віноўнага: яго свята адзначалася толькі адзін раз у чатыры гады (Раманаў, 1891). Аднак, хоць 29 лютага бывае толькі ў высакосны год, царкоўнікі ў іншыя гады пераносяць прысвятак прападобнага Касьяна Рымляніна на 28 лютага.

**14/1. Аўдоцця Вясноўка (Яўдоха, Аўдоння, Аўдуська, Яўдокі, Яўдоха, Галдакей, Аўдакей, Аўдокій).** У царкоўным календары -- звычайны дзень. Невялікі шэраг кананізаваных імён у ім пачынае прападобнапакутніца Еўдакія (каля 160-170 г.).

Беларуская народная традыцыя выяўляе на пачатку вясны значную колькасць абрадаў і гульняў, якія гавораць аб вялікім святкаванні. Рэшткі іх праяўляюцца ў адзначэнні Аўдоцці Вясноўкі як першага дня вясны і пачатку новага земляробчага года. Нездарма многія варыянты валачобных песень сведчаць аб аддачы перавагі перад усімі святамі ў годзе менавіта першаму веснавому дню, які называюць "Ясень Красен", "Нова Лета", "Божа Лета", "Збор", "Ізбор", "Аўдакея".

Каля Бога
Усе святыя
Шахуюцца,
Рахуюцца,
Катораму святцу
Упярод ступіць.
**Ясень Красен**
Упярод пайшоў...

*(Зап. ў 1938 г. у г.Рызе).*

Пра Аўдоццю Вясноўку валачобныя каляндарныя песні апавядаюць: "Аўдакея, перва святца..." (Зап. у 1940 г. у Каплаўскай вол. Ілукстэнскага п.); "Святы Аўдакей сохі збіраіць..." (Зап. у 1976 г. у Полацкім р-не.); "Святы Еўдакей -- веснавы святок, // Веснавы святок -- пераступ года. // Пераступілі ў яго слядочкі, // У яго слядочкі ўсе святочкі..." (Зап. у 1976 г. у Лепельскім р-не.); "Святы Яўдакеі зіму рушылі..." (Зап. у 1976 у Полацкім р-не.); "Святы Аўдакей бычкоў пое..." (Зап. у Барысаўскім р-не.).

Народны каляндар сцвярджае, што Аўдакея -- веснавае свята, якое трымае ў руцэ лета. Па гэтаму дню прыкмячалі надвор'е -- ці нап'ецца певень або вол з-пад страхі. Па назіраннях Ю.Крачкоўскага (1874). У Вілейскім павеце сяляне лічылі, калі Галдакей цёплы, то вясна і лета будуць цёплымі, асабліва спрыяльным будзе сенакос. Калі ідзе дождж -- чакай ураджай на жыта. Калі моцны мароз, то замарозіць грэчку ў час цвіцення. Калі туман, то пашанцуе з ураджаем на стручковыя расліны. Калі ж мяцеліца і завея, то неабходна чакаць вялікага голаду.

Лічыўся нешчаслівым днём, "бабскім святам", таму "не пралі, не снавалі" і не выконвалі іншыя работы. Але гэта не датычыла мужчын (Пшчолка, 1912). У Лельчыцкім раёне гаварылі: "Прадзі гульцяй, бо будуць голыя бокі, як не прасьцімеш"; "На Оўдокый памідоры на расаду сажалі і на окне дзержалі" (Лельчыцкі раён; Талстая, 1984).

Нямала назіранняў занатавана фалькларыстамі мінулага: “На Яўдокі голы бокі” (Радчанка, 1888), “Яшчэ няма Яўдокі, а ўжо свецяцца бокі, нацца покуль прыйдзе Вярбіч, то суздром будзеш голы, як біч” (Пяткевіч, 1938), “Свята Аўдакея сокі збіраець”, “Калі на Аўдакея мяцель, дык прыйдзецца гаспадаркам пунькі вымятаць” (Слупскі, 1892).

У некаторых раёнах "гукалі вясну". Хаця, бывала, і добра яшчэ трымалася зіма. “Яўдохі -- снегу па бокі”, -- гавораць у Іванаўскім раёне.

Варыянты тэкстаў валачобных песень сведчаць, што адзначэнне прападобнапакутніцы Еўдакіі развіла традыцыю народнага святкавання Аўдоцці Вясноўкі на аснове язычніцкага святкавання першага дня земляробчага года, які ў песнях названы "Ясень Красень", "Нова Лета", "Божа Лета", "Збор", "Ізбор". Апошнія дзве назвы засталіся асобным святам.

Раней у Рыме ў гэты дзень праходзіла цырымонія Мамуралія, згодна якой з горада выганялі палкамі чалавека ў шкурах Мамурыуса Ветурыуса (Mamurius Veturius – інтэрпрэтуецца як “стары Марс”). Гэта сімвалізавалася як выгнанне зімы і старога году (КЗ, 1977. С.15).

**15/2. Хвядот.** Свяшчэннапакутніка Фядота, епіскапа Кірынейскага (каля 326) народ празваў па простаму Хвядот. На гэты прысвятак засцерагаліся моцных вятроў. "На Хвядота занос -- усё сена знясе" (Паўлюкоўскі, 1934), “На Фядота снегавы занос” (Анічэнка, 1992), "На Фядота занос -- доўга прыпару не будзе" (Ляснічы, 1990). Лічылася, што

першы дзень вясны адлюстроўвае стан надвор'я ўсёй веснавай пары, а другі – летняй (Крачкоўскі, 1874).

**17/4. Герасім Гракоўнік.** Царкоўны каляндар падарыў народнаму прысвятку імя прападобных Герасіма Іарданскага (475) і Герасіма Валагодскага (1178), а народная назіральнасць і фантазія -- сваё прозвішча, азначэнне. Гэты дзень замацаваўся як дзень прылёту гракоў. "Герасім гракоў прыгнаў" (Ляснічы, 1990). Існуе прыкмета: гракі сядзяць ужо ў гнёздах -- на дружную вясну, калі лётаюць бязмэтна або і зусім іх не відаць у аселіцы -- вясна будзе павольная, часцей позняя (Санько, 1990). Папярэдні, трэці, дзень вясны прадказвае па надвор'і восень, а чацвёрты – зіму (Крачкоўскі, 1874).

**18/5. Конагароднік (Конан Агароднік).** У царкоўным календары -- Конан-агароднік (III ст.) і іншыя кананізаваныя імёны. Конан выводзіць усіх на агароды. У Беларусі гэта дзень падрыхтоўкі да пасадкі расады капусты (Ляснічы, 1990).

**Марк.** Лічылі, што грак вяртаецца з выраю на Марка (Анічэнка, 1992). Прападобны Марк жыў у IV ст.

**19/6. *Язэп.*** Каталікі Заходняй Беларусі ўшаноўваюць аднаго са святых. "Як святы Язэп кіўне барадою, дык зіма ўцякае ўніз галавою". Здаралася, што ў веснавыя "паставыя" дні, калі касцёл забараняў шлюб, вяселлі ўсё-такі адбывалася. На гэты конт народ меў прыказку: "Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту" (Паўлюкоўскі, 1934). Добрае надвор'е на Язэпа лічылася спрыяльным. "На Язэпа пагода -- год ураджайны" (БСК, 1937).

**22/9. Саракі (Соракі, Сарака, Саракасвятыя, Сорак пакутнікаў).** У народзе казалі, нібы на Саракі прылятае 40 "выраяў", а таксама, што гэта свята "пчальніковае" і ўжо канчаткова прыходзіць вясна. Гаварылі: “На Саракі дрэвы адпушчаюцца” (Сяліцкі, 1986), " На Саракі мужык пытаецца, ці далёка да ракі"; "Святыя Саракі ў поле саху валаклі". Выпякалі з цеста для дзяцей 40 жаваранкаў, у некаторых мясцовасцях -- 40 варэнікаў, 40 маленькіх піражкоў, галушак. Кожнаму неабходна з'есці 40 клёцак. На Случчыне пяклі "патапцы", якія называлі "жаваранкамі". Іх падсалоджвалі, абсыпалі макам для дзіцячага пачастунку. Выпякалі таксама пірагі ў выглядзе сельскагаспадарчых прылад: бараны, сярпа, касы, сахі і інш. Згодна павер'ям, сарока пачынае віць сабе гняздо і прыносіць для гэтага 40 пруцікаў. Але чакалі яшчэ сорак маразоў. Нібыта з выраю тады прылятае сорак жаваранкаў. Хлопчыкі павінны да ўсходу сонца, не памыўшыся і закрыўшы вочы, падабраць на двары сорак трэсак і высыпаць іх пад печ або перакінуць цераз хату столькі ж палачак. Хто выканае гэта, той вясною знойдзе 40 птушыных гнёздаў (або сорак качыных яек).

Засталося нямала назіранняў і сведчанняў, якія гавораць аб свяце птушак: “На Саракі пыляцелі з-за мора птакі” (Слупскі, 1892), “Ластаўкі вылятаюць з возера” (якія восенню туды апусціліся) (Пшчолка, 1912), “На

Саракі... вылятае з цёплага краю вястун вясны жаваранак; пасля яго гракі, што бывае за 12 дзён да адкрыцця вады” (Невяровіч, 1859).

Вобразы птушак багата прадстаўлены ў народным мастацтве. Добра характарызуюць свята валачобныя песні: “Святыя Саракі напярод пайшлі” (Віцебская губ.), “Ды Саракі дровы рубюць, клады кладуць” (Каплаўская вол. Ілукстэнскага пав.), “А і Саракі ды, вой, плятуць смыкі” (Лепельскі р-не.), “Святы Саракі – да не йдзі да ракі” (Полацкі р-не.), “Святы Саракі – сорак вырай вылятаюць” (Лепельскі р-не.), “Саракі ільды дралі, птушак напушчалі” (Веліжскі пав. Віцебскай губ.), “Святы Саракі – лемяшы істраць” (Лепельскі пав. Віцебская губ.), “Святыя Саракі ў поле саху валаклі” (Барысаўскі р-не.).

Народ ведаў, што "на Сорак мучанікаў дзень з ноччу мераецца"(Паўлюкоўскі, 1934). Відаць, у старажытнасці ён звязваўся з вясеннім раўнадзенствам, ад якога пачыналася вясна (дзень астранамічнага вясенняга раўнадзенства 20-21 сакавіка). У Свіслацкім раёне на Саракі сажаюць расаду.

У Ельнінскім павеце дзеці праводзілі цікавую гульню: выконвалі пахаванне "трункі" з насякомымі, спявалі: "Жылі не сяляне, памерлі не радзіцелі"(Дабравольскі, 1914). Малыя і дарослыя гушкаліся на арэлях, "каб лён рос" , скакалі на дошках. “ У гэты дзень ёсць звычай двaім гушкацца на дошцы, стоячы на ўвесь рост. На Саракі бесперапынна трэба скакаць на дошцы, штоб пагрэцца за тых бедненькіх мучаніках, што не маючы як сагрэцца, памерзлі насмерць” (Пяткевіч, 1938).

У гэтым сваце бачыцца перапляценне старадаўніх язычніцкіх рэлігійных уяўленняў з хрысціянскімі і дамінаванне ў сінкрэтычным развіцці першых; праяўленне фетышызму ("жаваранкі" з цеста), анімізму (пакланенне птушкам: качцы, жаваранку), магіі (перакідванне палак цераз хату і інш). Ад хрысціянства ў гэтай добра развітай традыцыі засталася назва, з сарака чалавек, што пакутавалі ў Севасційскім возеры каля 369 года, народны каляндар асабіста вылучае толькі пакутніка Прыску па рыфмавай асацыяцыі з вясновай птушкаю пліскай.

Добра развітая традыцыя свята развілася ў народаў Югаславіі. Дзень 40 пакутнікаў па царкоўнаму і народнаму календарах адзначалі сербы, чарнагорцы, македонцы, нават мусульмане паўднёваславянскага паходжання ў Македоніі. Як і ў нас, цудадзейным лічылася “40” (40 маленькіх абаранкаў, 40 зёрнаў, 40 келіхаў гарэлкі і г.д.)

**Пліска.** Праваслаўны прысвятак па сутнасці не адрозніваецца ад каталіцкай Прыскі. "На святога Пліска праб'ець лёд і пліска" (Насовіч, 1874). “Ранняе з'яўленне пліскі і бусла прадказвае выдатны ўраджай ільну” (Берман, 1870).

**25/12. Рыгор.** "На Рыгора зіма ідзе ў мора" (Паўлюкоўскі, 1934). У народнай песні спяваецца:

А святы Рыгор спусціў ваду з гор,
Ваду ў зямлю, а з зямлі траву.

**Феафан.** У народзе прыкмячалі, калі дзень пачынаецца з туману, то варта чакаць добрага ўраджаю льну і канопляў (Ляснічы, 1990).

Народны каляндар вылучыў у царкоўным два імені святога Рыгора Дваеслова, папы Рымскага (604 г.), і прападобнага Феафана Спавядальніка, Сігрыанскага (818 г.).

***Дабравешчанне (Звеставанне)*** -- веснавое свята прылёту птушак. Аб характары яго сведчаць прымаўкі: "На Дабравешчанне Бог багаслаўляе ўсе расліны"; "На Дабравешчанне і птушка гнязда не кладзе"; "Дабравешчанне як захоча, дык і бусел заклякоча". "На Дабравешчанне звон, а ў морквы дух вон" (траціць сок); "У каго хлеба шмат, Дабравешчанню рад"; "На Дабравешчанне цёпла -- ураджай на арэхі" (Паўлюкоўскі, 1934). "Калі пчала выйдзе з вулля яшчэ да Дабравешчання -- лета будзе благое, беднае" (Берман, 1870).

Праводзілі "гуканне вясны".

У скандынаўскіх краінах – гэта дзень веснавой Богамаці, або веснавая меса Марыі, лічылася, што ў гэты дзень прылятаюць жураўлі, што “прыносяць святло” (КЗ, 1977. С. 115).

Бельгійцы, галандцы, народы Скандынавіі называлі днём Багародзіцы і верылі, што па ім можна прадказваць надвор'е: калі надвор'е 25 сакавіка добрае, то і год будзе ўраджайным (С. 76). У некаторых іншых краінах Еўропы свята таксама звязана з птушкамі. Скандынавы і фінскія лапары лічаць, што ў гэты дзень прылятаюць жураўлі і “прыносяць святло” (С. 136).

(Гл. таксама 7 красавіка).

**26/13. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка) -- забарона на "запасванне" кароў. У Мінскай губерні была такая завядзёнка: у перыяд паміж каталіцкім і праваслаўным Благавешчаннем, калі селянін не выгнаў першы раз кароў да 13 сакавіка, то не выгане і ў Міжблагавешчыны. "Запасванне" жывёлы ў гэтую пару, на думку сялян, наклікае на статак ваўкоў, якія прыносяць вялікую шкоду. Каб пазбегнуць няшчасця, беларус стараецца не даваць у доўг рэчы, асабліва кроснавыя бёрды (Дземідовіч, 1895).

**30/17. Аляксей Цёплы (Аляксей Весняны, Аляксей, Алексій, Алёксы, Ляксей, Алісійкі).** Лічыцца цёплым веснавым днём, з ім звязана нямала народных прыкмет. "На Ляксея вол павінен з лужы напіцца" (Паўлюкоўскі, 1934). “У прамежак часу ад Аўдакеяў да Алёксаў сонца штодня падрастае на таўшчыню мезенага пазногця” (Нікіфароўскі, 1897). “На Аляксея зіма пацея” (Слупскі, 1892). Чакалі прылёту жураўля ці бусла. Бусько кажа: "На Лексія хоць заб'юся, а з'яўлюся" (Столінскі р-н; Талстая, 1986). Дзень рыбалова. "На Аляксея лёд такі слабкі, што его і рыба хвастом

разаб'е" (Рэчыцкі п. Пяткевіч, 1938). Плялі сеткі. У валачобных песнях спявалі: "Аляксею сеці садзіць, лодкі смаліць, рыбу коліць" (Полацкі р-н.). “Аляксею --сані на плот, рыба аб лёд, лёд вадою, рыба лускою” (Дзісненскі п. Віленскай губ.) Аглядалі ("тварылі") вуллі. На Палессі вядома прымаўка: "На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою". Калі былі цяжкасці з сенам, то палешукі не чакалі Юр'я, не звярталі ўвагу на Міжблагавешчыны, а выганялі "тавар на чарнагалоў", першую зеляніну ў балоце, або "на верас". Тут мелася на ўвазе любая мінулагодняя расліннасць, якую мусілі перабіраць згаладалыя пасля цяжкай зімы каровы.

У некаторых раёнах пачыналі сеяць лён, авёс. “Аляксей лемяшы істрыць і сохі путрыць” (Барысаўскі п. Мінскай губ.; з валачобнымі песнямі). Не ткалі, перад сном дзяўчаты гадалі пра будучае замужжа. "Святый Олэксію, я на тобі лён сію, Дай, Божэ, знаты, з кім буду ў пары стаяты" (Пінскі р-н; Талстая, 1986). А ў некаторых мясцінах наадварот трэба было “саткаць Аляксею рубашку” (Навасібірская вобл., беларусы-перасяленцы з-пад Рагачова; Васілевіч, 1998).

Некаторыя народныя загадкі сведчаць аб цяснейшай сувязі з жыццём прападобнага Алексія, чалавека Божыя, які пакінуў родны Рым і дастатак у доме дзеля аскетычнага служэння Выратавальніку, ад якога атрымаў імя “Чалавека Божыя”. На свята “рыбакам дазваляецца рабіць “абудзённыя” сеткі: г. зн. за гэты дзень напрасці нітак і звязаць з іх браднік ці якую іншую прыладу. Тады яны ёю будуць лавіць шмат рыбы. Робіцца гэта на той падставе, што святы Алексій, пакідаючы бацькаўскі дом, нібыта пераплыў мора ў плеценым рэшаце” (Раманаў, 1912).

Парэшткі святога Алексія пахаваны 17 сакавіка 411 г. у храме святога Ваніфацыя. І цяпер у Рыме паказваюць турыстам месца, дзе быў дом бацькоў “Чалавека Божыя”.

Нямала падобнага ў адзначэнні дня Цёплага Аляксея маецца ў румын. Вось нават яго назвы: Алексій, Алекса, Аляксей Цёплы, Omul lui dumnezeu cel cald (Божы чалавек цёплы). Адчуваецца пашана да жывёл ў гэты дзень. Былі рытуалы ў пчалаводаў і рыбаловаў (КЗ, 1977. С. 302).

***Крашчаты (Храстовы, Кросны) тыдзень** – пачатак чацвёртага тыдня Вялікага посту. Пяклі “храсты” (вырабы з цеста ў выглядзе бараны, іншых сельскагаспадарчых прылад), якія бралі на засеўкі.

***Благавесны тыдзень.** Хавалі з вачэй кросны і “благавеснавалі” (святкавалі).

***Кросная серада (Серадапосце)** – серада на чацвёртым тыдні Вялікага посту. Раней гаварылі пра яўрэйскае свята Пурым – “жыдоўскія крастцы” (Ярмолаў, 1901. С. 107). Таксама пяклі “храсты”, якія захоўвалі на Засеўкі. Параўноўваючы традыцыі ўсходніх славян, В.Сакалова падкрэслівала, “што ў беларусаў выпякалі таксама печыва ў форме землеробчых прылад – аграрная магія выступае тут зусім выразна.

Паходжанне звычая – несумненна вельмі старажытнае, і не выпадкова, ён у падобных формах быў распаўсюджаны паўсюдна ва ўсіх усхрдніх славян" (1979. С. 94-95). Можна таксама пагадзіцца з рускай даследчыцай у тым, што гэты рэлікт сельскагаспадарчай магіі не меў раней ніякіх адносін да хрысціянскага календара ці ва ўсякім выпадку ўзнік на аснове язычніцкіх традыцый. Дарэчы, раней тлумачылі назву словам "трэск", г.зн. пост пераламваецца напалову, што чуваць трэск.

Немцы заўважылі, што на Серадапосце (Oculi) алень губляе рогі (Ярмолаў, 1901. С. 107).

На Пулпосце (Polposcie) у Польшчы існаваў звычай з "журам" (поснай пахлёбкай) (КЗ, 1977. С. 208).